Марына Ігнатовіч



# НОВЫЯ КІРУНКІ Ў ПРАЕКТНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ГРОДЗЕНСКАЙ АБЛАСНОЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ Я.Ф. КАРСКАГА

**Намеснік дырэктара**
**Гродзенскай абласной навуковай**
**бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага**

У сучасных умовах адным з важных і эфектыўных кірункаў у бібліятэчнай рабоце з'яўляецца распрацоўка праектаў і праграм. Дзяржаўная ўстанова культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага» (абласная бібліятэка) актыўна займаецца праектнай дзейнасцю, у тым ліку і на міжнародным узроўні.

Прыкладзеныя намаганні далі свой плён. Так, у межах праграмы транспамежнага супрацоўніцтва Польшча – Беларусь – Украіна (2007–2013) атрыманы грант Еўрапейскага Саюза для адкрыцця ў дзіцячым філіяле інтэрактыўнага цэнтра навукі і тэхналогій «Мульціцэнтр». Рэалізацыя праекта пачалася ў снежні 2013 г. Дарэчы, гэта ўжо другі праект, распрацаваны сумесна з Бібліятэкай імя М. Канапніцкай у Сувалках (Рэспубліка Польшча). Дзейнасць першага ў Беларусі такога «Мульціцэнтра» будзе накіравана на развіццё талентаў і здольнасцей дзяцей.

У канцы 2013 г. абласной бібліятэкай атрымана бясплатная замежная дапамога ад Пасольства ЗША ў Рэспубліцы Беларусь на абсталяванне відэа- і аўдыяапаратурай залы ў аддзеле выданняў на замежных мовах.

Супрацоўнікамі бібліятэкі распрацаваны і рэалізуюцца шматлікія акцыі, творчыя праекты і дабрачынныя праграмы, якія ахопліваюць амаль усе асноўныя напрамкі дзейнасці: абслугоўванне карыстальнікаў, фарміраванне інфармацыйнай культуры, правядзенне сацыякультурных мерапрыемстваў, выдавецкая дзейнасць і г. д.

З вялікім поспехам праходзяць мерапрыемствы ў межах творчага праекта «Дакрануцца да гісторыі», асноўная мэта якога – распаўсюджванне інфармацыі пра багацейшую гісторыка-культурную спадчыну гарадзенскай зямлі.

У межах праекта ў бібліятэцы адбываліся:

– міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя памятным і знамянальным датам («Пісьменніца. Грамадскі дзеяч. Жанчына: да 170-годдзя з дня нараджэння Э. Ажэшкі» (2011), «Нацыянальны гонар Беларусі: да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа» (2012), «Беларусь – Літва – Польшча: дыялог народаў і культур» (2013). Па выніках канферэнцый выдаюцца зборнікі матэрыялаў;

– Гарадзенскія навуковыя чытанні, якія прысвячаюцца важным падзеям і знакамітым асобам Гродзеншчыны. Яны сталі адметнай навуковай падзеяй у жыцці Гродна, паколькі сёння з'яўляюцца фактычна адзінай пастаяннай навуковай пляцоўкай, дзе абмяркоўваюцца праблемы, звязаныя з гісторыяй і культурай Гродна і Гродзеншчыны;

– выставы рэдкіх кніг, дакументаў, фотаздымкаў, паштовак і экспанатаў з фонду абласной бібліятэкі і прыватных калекцый гродзенцаў. Назвы выстаў гавораць самі за сябе: «І славілі Айчыну меч і слова: да 200-годдзя Айчыннай вайны 1812 года», «Духоўная спадчына стагоддзяў: рарытэты з былой бібліятэкі Ордэна Айцоў Францішканаў у Гродне», «Гродна і гарадзенцы часоў Элізы Ажэшкі», «Гродна XX стагоддзя», «Матэрыяльная культура Гродзеншчыны мінулых стагоддзяў: прадметы быту, працы і хатняга ўжытку»;

– прэзентацыі кніг гродзенскіх краязнаўцаў у серыі «НгопаГродна» В. Саяпіна, І. Трусава, якія прысвячаюцца гісторыі Гродзеншчыны;

– адкрытыя прагляды літаратуры. Напрыклад, прагляд «Гродна сто гадоў таму…» пазнаёміў чытачоў абласной бібліятэкі з матэрыяламі пра асаблівасці грамадскага, культурнага, спартыўнага жыцця гарадзенцаў у далёкім 1913 г. Выстава была дапоўнена фактаграфічным матэрыялам і фотаздымкамі тагачаснага і сучаснага Гродна.

Акрамя таго, з улікам турыстычнага патэнцыялу горада над Нёманам, падрыхтаваны і выдадзены рэкламныя буклеты на беларускай, рускай і польскай мовах, прысвечаныя гісторыка-культурным помнікам Гродна («Каралеўскія замкі», «Каложская царква», «Касцёл Святога Францыска Ксаверыя», «Лютэранская кірха» і інш.). Гэта матэрыялы карыстаюцца папулярнасцю сярод гарадзенцаў і шматлікіх турыстаў.

Своеасаблівым брэндам абласной бібліятэкі з'яўляецца Домік сусветна вядомай пісьменніцы Э. Ажэшкі, у якім размешчаны аддзелы бібліятэкі. Адноўлены традыцыі пісьменніцы: працуюць мемарыяльны пакой, прысвечаны жыццю і творчасці Ажэшкі і літаратурна-музычны салон «У пані Элізы», выдадзены буклет «Домік Ажэшкі» на беларускай, рускай, польскай і англійскай мовах, на сайце абласной бібліятэкі ўстановы размешчана «Віртуальнае падарожжа па Доміку Элізы Ажэшкі», штогод праводзяцца дабрачынныя елкі для дзяцей-сірот.

Так, напярэдадні Новага года праходзіць ужо традыцыйнае свята «Каляды ў Элізы Ажэшкі». Асабліва запамінальным яно было ў 2012 г. Супрацоўнікамі бібліятэкі у рамках праекта «Жывая гісторыя» сумесна з мясцовымі ўладамі праведзены шэраг мерапрыемстваў для дзяцей-сірот (свята каля елкі з





казачнымі героямі, вернісаж дзіцячага малюнка, дабрачынны аўкцыён). Дзеці малявалі сваё бачанне навагодняга свята і каляд, а таксама запісвалі, што хацелі б атрымаць ад Дзеда Мароза. І іх жаданні споўніліся.

1 чэрвеня 2013 г. каля Доміка Ажэшкі ладзілася вялікае гарадское свята «Эліза Ажэшка запрашае», прымеркаванае да дня нараджэння пісьменніцы і Дня абароны дзяцей. На тэрыторыі вакол Доміка кожны з гарадзенцаў і гасцей горада мог пазнаёміцца з лепшымі выданнямі з фонду бібліятэкі, экспантамі з прыватных калекцый гарадзенцаў, а для маленькіх удзельнікаў свята былі арганізаваны гульні, конкурсы, танцы. Удзел у мерапрыемстве прымала сама пані Эліза, у ролі якой выступала супрацоўнік бібліятэкі.

Нашым калектывам рэалізуецца і творчы праект «Яны ўзбагацілі культуру Гродзеншчыны», які прадугледжвае арганізацыю вечарын памяці да юбілейных дат найбольш выбітных дзеячаў культуры Прынёманскага краю. У 2013 г. яны прысвячаліся жыццю і дзейнасці В. Губіча, А. Шыдлоўскага, А. Цяжкага і інш.

Папулярызацыя чытання – паўсядзённая работа любой бібліятэкі, але пры сённяшніх аб'ёмах інфармацыі і «дэфіцыту часу» яна можа быць паспяховай толькі ў тым выпадку, калі выходзіць за бібліятэчныя сцены і не скавана звыклымі ўяўленнямі. Сёння перад кожным бібліятэкарам стаіць задача арганізоўваць «жывыя» (гэта значыць пазнавальныя і цікавыя для шырокага кола грамадзян, якія не з'яўляюцца чытачамі) выставы літаратуры ці адкрытыя прагляды.

З мэтай рэкламы кнігі і заахвочвання грамадства да чытання ў бібліятэцы праходзяць шматлікія акцыі, дэвіз якіх – «Чытанне – шлях да поспеху».

Вялікую цікавасць у жыхароў абласнога цэнтра выклікала выстава-акцыя «Што чытаюць гарадзенцы», якая ўключала водгукі вядомых людзей нашага горада, сярод якіх – начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама, мэр горада, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, музыканты, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, навукоўцы, акцёры, на прачытаныя імі кнігі, што найбольш запомніліся.

Мы плануем працягваць гэту традыцыю, наступная выстава пазнаёміць жыхароў і гасцей абласнога цэнтра з любімымі кнігамі дзяцінства вядомых людзей Гродна.

Своеасаблівай рэкламай чытання з'яўляюцца надпісы на майках «Чытаць – прэстыжна», якія выкарыстоўваюцца падчас правядзення масавых мерапрыемстваў, у першую чаргу па-за сценамі бібліятэкі.

З мэтай папулярызацыі лепшых выданняў з фонду бібліятэкі калектывам рэалізаваны творчы праект «Свет ведаў кніга адкрывае». У яго межах прайшлі дні навуковай кнігі, праваслаўнай літаратуры «Праз кнігу – да дабра і свету», мастацкай кнігі «Мастацкая літаратура ў кантэксце часу», экалагічнай літаратуры «Калі вам даспадобы зямная прыгажосць», дакументаў па правазнаўстве «Прававая літаратура – у дапамогу навучальнаму працэсу», выданняў на замежных мовах «Літаратура на мовах народаў свету».

Варта адзначыць, што на сённяшні дзень мы «папулярныя», і большасць юбілейных мерапрыемстваў арганізацый і прадпрыемстваў Гродна ўпрыгожваюць выставы дакументаў з фонду бібліятэкі.

Важнай задачай, якая стаіць сёння перад бібліятэчнай супольнасцю, з'яўляецца фарміраванне інфармацыйнай культуры і камп'ютарнай граматнасці. У бібліятэцы распрацавана праграма навучання людзей старэйшага ўзросту асновам камп'ютарнай граматнасці, а таксама праводзяцца заняткі па навучанні бібліятэчна-бібліяграфічным ведам рознаўзроставых груп.

Хацелася б адзначыць і актыўнае супрацоўніцтва нашай установы са сродкамі масавай інфармацыі. Рэалізуюцца сумесныя праекты з мясцовымі газетамі «Гродзенская праўда» і «Перспектыва». Штотыднёва супрацоўнікі аддзелаў абслугоўвання выступаюць з аглядамі літаратуры на «Радыё Гродна» ў спецыяльна створанай рубрыцы «Раім пазнаёміцца. Лепшыя выданні».

Супрацоўнікі бібліятэкі як і ўсе бібліятэчныя ўстановы, займаюцца пазабюджэтнай дзейнасцю. Так, у 2013 г. калектывам зароблена 404,7 млн руб. (2012 г. – 252,6 млн руб.). На сённяшні дзень да паслуг чытачоў – 83 віды платных паслуг (ксеракапіраванне дакументаў, выдача дакументаў з чытальных залаў, экспрэс-абанемент, выкананне складаных краязнаўчых даведак і інш.).

Карыстаюцца папулярнасцю курсы па вывучэнні англійскай, нямецкай, французскай, польскай, іспанскай і італьянскай моў, выязныя дні інфармацыі на прадпрыемствах і ўстановах Гродна. Бібліятэчным абслугоўваннем ахоплена 15 арганізацый абласнога цэнтра.

Матэрыялы з фонду бібліятэкі выкарыстоўваюцца для падрыхтоўкі гісторый прадпрыемстваў і ўстаноў, адкрыцця пры іх музеяў і г. д.

У спецыяльна абсталяваным дзіцячым пакоі праводзяцца святы для дзяцей, самым запатрабавальным з іх з'яўляецца Дзень імяніннніка ў бібліятэцы.

Новай формай работы для супрацоўнікаў бібліятэкі стала арганізацыя і правядзенне тэматычных вечароўканцэртаў. Падчас іх гродзенцы (і не толькі) мелі магчымасць пачуць «Романса трепетные звуки», «Городской романс в стиле шансона», «Осени чарующие звуки» ў выкананні лепшых артыстаў Гродна.

Увесь аб'ём работы – падбор рэпертуару, пошук прафесійных выканаўцаў, гукарэжысёраў і інш., падрыхтоўка і распаўсюджванне афіш, білетаў і праграм – выконваюць супрацоўнікі бібліятэкі.

Спыняцца на дасягнутым мы не збіраемся і ў будучым спадзяёмся рэалізаваць новыя творчыя праекты.

**Summary**

Tells about the project activities of the Grodno regional scientific library, aimed at popularization of reading, teaching respect for their country.